Край беларускі,
край гераічны

ПАРТЫЗАНСКІ ДАНКА

Іграў гармонік, развітальныя песні спявалі майданаўскія хлопцы і дзяўчаты. Сабралася ледзь не ўся вёска. Брыгадзір Пётр Галецкі ішоў служыць у Чырвоную Армію.

18 чэрвеня, вяртаючыся з камандзіроўкі ў часць, ён заехаў дамоў. Рукі засумавалі па мірнай працы. Пётр напілаваў дроў, прынёс вады. Але хіба многа паспееш, калі заўтра трэба ад'язджаць.

А праз тры дні грымнула вайна. У Майдан паштальён не прынёс ад Пятра ні тэлеграмы, ні пісьма.

...У адну з маскоўскіх кватэр хуткімі крокамі ўвайшоў малады салдат. На ім была новая, з-пад іголачкі форма. У кватэры жыла яго цётка Алёна. Увайшоўшы, ён паспешліва пачаў вымаць з ранца і класці на стол розныя паперы.

— Тут пісьмы і фотакарткі, — сказаў ён. — Схавай.

На твары Пятра святілася ўсмешка. Перад адыходам растлумачыў прычыну свайго добрага настрою:

— Лячу, цёця, на нашу родную беларускую зямлю біць фашыстаў.

Хутка ён убачыў гэтую зямлю. Глыбокія раны былі на яе целе. Яна цяжка стагнала і клікала яго жорстка адпомсціць праклятым выродкам за гора і пакуты. Мацней сціскаў зброю малады партызан Пётр Галецкі, смела рваўся ў бой.

Загады камандзіра ён заўсёды выконваў дакладна. У што б там ні стала павінна быць выканана і гэтае заданне: сёння ноччу трэба ўзарваць варожы эшалон і сабраць звесткі аб аэрадроме паблізу Віцебска.

...Спыніўшыся ў маладым сасонніку, падрыўнікі назіралі за чыгункай. Нямецкія патрулі хадзілі па палатне няспынна. Але занадта маленькія прамежкі часу былі паміж абходамі вартавых. І вось за гэты прамежак і трэба было паспець паставіць міну.

Ляжалі ўжо з паўгадзіны. Прайшоў цяжка гружаны поезд на Смаленск, а партызаны не маглі нічога зрабіць. Да болю сціснуў зубы Пётр. «Нічога, — супакоіў ён сябе, — пакажацца наступны поезд, і я хуценька пастаўлю міну».

З зарадам толу ён папоўз да палатна. Сябры, замаскіраваўшыся ў сасонніку, трымалі на прыцэле вартавых. Некаторы час яны чулі лёгкі шоргат, потым усё сціхла. Неўзабаве з боку Віцебска пачуўся шум поезда. Гэты таксама спяшаўся на фронт, вёз смяротны груз.

Пётр моцна прыціснуўся да халодных грудзей зямлі. Здаецца, урос у яе. Вось ужо зусім выразна чуваць рытмічны перастук колаў. Пякучая нянавісць да ворага перапоўніла сэрца байца. Ён, яшчэ шчыльней прыпаўшы да зямлі, папластунску папоўз да насыпу. Мінуты здаваліся гадзінамі.

На нейкую мінуту пражэктар паравоза выхапіў з цемры адзінокую фігуру падрыўніка. Старшы групы Давыдоўскі ціха сказаў:

— Не паспее, Пятро, не паспее...

Хвалявaліся і астатнія двое. Яны бачылі, што высокі і круты насып, цяжкая міна перашкаджаюць Пятру ўскочыць на палатно. Нарэшце ўскочыў. Але падкласці міну было ўжо немагчыма: да паравоза заставаліся лічаныя крокі.

Раптам Пётр ірвануўся наперад і... кінуўся на рэйкі. Пачуўся магутны выбух, задрыжэла зямля. Высокі вогненны слуп прашыў паветра, і жывыя бачылі, як узняўся на дыбкі паравоз і кульнуўся пад адхон, як, набягаючы адна на адну, са страшэнным трэскам і скрыгатаннем пачалі перакульвацца платформы, на якіх стаялі цыстэрны з бензінам, аўтамабілі, гарматы. З велізарных бакаў, прабітых і пакарабачаных, паліўся бензін, і палымяны лівень забушаваў на палатне, заліваючы прыдарожны хмызняк. Узрываліся ўсё новыя і новыя цыстэрны, і ўсё шырэй разлівалася мора агню. Дрыжэлі зямля і паветра.

Гэта быў развітальны салют доблесці і славе партызана, моцнаму духу і бяспрыкладнаму подзвігу, велічы душы і высакароднасці савецкага чалавека. З гэтым салютам скончылася жыццё Пятра Галецкага — камсамольца, былога брыгадзіра паляводчай брыгады калгаса «Гігант». З гэтага салюта пачалася яго бессмяротнасць.

Пятру Антонавічу Галецкаму восенню 1942 года, калі ён здзейсніў свой подзвіг, было толькі 23 гады. Выхаванец камсамола, ён упісаў у камсамольскі летапіс яркую старонку. Але, на жаль, гэтая старонка да сёлетняга года заставалася непрачытанай. Толькі нядаўна сталі вядомы падрабязнасці подзвігу. А тады, у 1942 годзе, партызанскі паэт Марк Максімаў прысвяціў Пятру Галецкаму верш, які чыталі і перачытвалі народныя мсціўцы з атрада «Перамога». Цяпер яго напамяць ведаюць на радзіме Пятра — у вёсцы Майдан. Вось гэты верш:

І ўбачылі трое,
Як кінуўся з мінай адзін
Пад імклівы цягнік.
І — грукат!
І — зарыва к хмарам!
І здавалася ім,
Што гэта гарэў не бензін,
А гарачае сэрца
Палала магутным пажарам.
Памянуты быў Данка
У той дзень апярзводкай
палка!
Хто не верыць легендам,
Дык праўдзе звычайнай
паверце:
Было вырвана сэрца
З гарачых грудзей юнака,
Каб людзей ратаваць
Ад пакутаў і смерці.

Быццам баявую песню пра казачна смелага чалавека падхапілі народныя мсціўцы гэты верш. І паляцелі яго радкі з атрада ў атрад, як рашучы заклік, у якім гучаў пафас бязлітаснай барацьбы, як святая клятва адпомсціць за сябра-таварыша, што аддаў сваё маладое жыццё дзеля жыцця на зямлі, — за Пятра Галецкага. «Нашым Данкам» называюць яго вучні Славенскай сярэдняй школы, у якой калісьці вучыўся Пётр.

Г. КАРАЛЕЎ.
Талачынскі раён.